УДК 821.161.3:82-1

**Д. С. Доўнар**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

# ПЕЙЗАЖ У ПАЭЗІІ ВІНЦЭСЯ КАРАТЫНСКАГА

**Уводзіны**. Пейзаж — карціна прыроды ў літаратурным творы, паэтыкі, якая можа мець разнастайнае ідэйна-мастацкае значэнне. Пейзаж выступае апісаннем месца дзеяння, абставін, у якіх адбываюцца падзеі; можа выяўляць думкі, перажыванні аўтара або герояў. Ён уключае таксама апісанне ў літаратурным творы розных мясцовасцей (горад, вёска, чыгунка і г. д.). Пейзаж займае рознае месца ў творах у залежнасці ад іх жанру, літаратурнага метаду (пейзаж рамантычны і рэалістычны) [4, с. 495]. Пейзаж стала ўвайшоў у літаратуру толькі ў XIX стагоддзя. У творах практычна кожнага буйнога пісьменніка-рэаліста гэтага часу прысутнічаюць пейзажныя карціны, якія выконваюць тую або іншую мастацкую функцыю, а часам і сумяшчаюць некалькі функцый [6, с. 130].

**Асноўная частка**. Формы мастацкай прысутнасці і функцыі пейзажу ў літаратуры даволі шматстайныя [6, с. 29]. Першая фунцыя пейзажу — гэта абазначэнне месца і часу дзеяння. «Менавіта з дапамогай пейзажу чытач наглядна можа ўявіць сабе, дзе адбываюцца падзеі (на борце цеплахода, на вуліцах горада, у лесе і г. д.) і калі яны адбываюцца (у якую пару года і час сутак)» [4, с. 130]. Другой функцыяй пейзажу з’яўляецца сюжэтная матывіроўка дзеяння. Дынаміка пейзажу адыгрывае вельмі істотную ролю ў пераважна хранікальных сюжэтах, дзе на першы план вылучаюцца падзеі, што не залежаць ад волі персанажаў [3, с. 130]. Наступная функцыя пейзажу звязана з перадачай душэўнага стану персанажаў і мае назву псіхалагічнай. «Гэтая функцыя найбольш частая. Менавіта пейзаж стварае псіхалагічны настрой успрымання тэксту, дапамагае раскрыць унутраны стан герояў, рыхтуе чытача да змен у іх жыцці» [5, с. 130]. Літаратурны пейзаж мае даволі разгалінаваную тыпалогію. У залежнасці ад прадмета, фактуры апісання, а таксама некаторых іншых якасцей і рысаў, вылучаюць пейзажы дзікі і культурны (або ачалавечаны), вясковы і гарадскі (або ўрбаністычны), лясны, стэпавы, марскі (марыністычны), паўночны, паўднёвы, экзатычны і г. д. [5, с. 131]. У сусветнай літаратуры ёсць шэраг жанраў (ідылія, буколікі, пастараль, эклога), у якіх пейзаж выконвае галоўную сюжэтабудаўнічую функцыю [5, с. 131].

Для беларускага паэта XIX стагоддзя Вінцэся Каратынскага апісанне родных прынёманскіх краявідаў стала важным элементам мастацкага свету твораў. Ён часта выкарыстоўваў у сваіх вершах элементы пейзажу з мэтай паказаць прыгажосць беларускай прыроды і адметнасць беларускага народа. Паэт нарадзіўся ў вёсцы Селішча Навагрannadskага павета. Ён быў адным з нямногіх, хто выбіўся «ў людзі» з прыгонных сялян. Сапраўднае яго прозвішча — Каратай.

«Уставайма, братцы!...» — верш, напісаны па-беларуску да прыезду Аляксандра II у Вільню як выклік аўгусцейшаму манарху, што не прызнаная ў вярхах беларуская мова жыве. Твор быў надрукаваны лацінкай і кірыліцай з падзагалоўкам «Песня з паклонам ад літоўска-русінскай мужыцкай грамады» ў верасні 1858 года як дадатак да прывітальнага адраса цару, складзенага А. Кіркорам, А. Адынцом, І. Ходзькам, Я. Тышкевічам і М. Маліноўскім, якія хацелі бачыць у новым манарху Расіі прыхільніка асветы і лібералізму [2, с. 305]. Гасціннасць беларускага селяніна-земляроба раскрываецца ў наступных радках:

Гдзе яго прымем? Чорная святліца,
Залатых тканак не судзіў нам Бог.
Што наймілейша — то матка-зямліца,
Жоўты пясочак на яе палёг [2, с. 9—10].

Слова «пясочак», ужытае з памяншальным суфіксам, перадае замілаванне сціплым, але родным пейзажам, сцвярджае патрыятычныя пачуцці.

Важным элементам пейзажу з’яўляюцца раніца, сонца, якое адорвае жыццём усё вакол:

Божае сонца бліснула на галі,
Дзяньку вясёла гуляць на дварэ,
Шле да нас пташкі, каб пець памагалі,
Туман прагнала, расу падбярэ [2, с. 10].

Вінцэсь Каратынскі да слова «сонца» ўжывае эпітэт «Божае», бо без сонца, без яго цяпла, энергіі жыццё чалавека проста спынілася б. Аўтар звяртаецца да матыву птушынага спеву, бо песня, музыка, мелодыя здольныя разагнаць туман недаверу.

Сведчаннем сапраўднай сталасці літаратурнага таленту Вінцэся Каратынскага стала паэма «Таміла». У цэнтры твора — вобраз беларускага селяніна Тамілы, шматгранны, па-рамантычнаму адметны і адначасова пераканаўчы ў мастацкіх адносінах. У паэме адчуваюцца спробы падступіцца да стварэння сапраўднага беларускага сялянскага эпасу — тое, што толькі больш як праз паўстагоддзя здзейсніць Якуб Колас [1, с. 72].

© Доўнар Д. С., 2019

Адметная рыса роднага пейзажу для героя паэмы «Таміла» — рака Нёман, якая злучае яго з малой радзімай, бо на нёманскіх берагах прайшло дзяцінства, у прынямонскай вёсцы жылі бацькі, блізкія людзі, якія, як увогуле беларускія сяляне, вылучаліся працавітасцю, добрасумленнасцю, гуманнасцю. Дзе б чалавек ні быў, ён усё ж імкнецца на сваю малую радзіму. Яго прываблівае ўсё тое, што акружала яго з маленства:

Дзякаваць Богу! Хоць клопат вярэдзіць,
Ды я ўсё ж вярнуўся да ніў прадзядоўскіх.
Вітай мяне, Нёман, стары мой суседзе!
Вітай жа мяне, прынямонская вёска… [2, с. 91].

Восеньскі пейзаж у паэме Вінцэся Каратынскага выклікае сум, песімістычныя думкі, нібыта прадвяшчае трагічны фінал твора. Жыццё нялітасцівае да Таміды, да яго ўнукаў, якія засталіся сіротамі:

Настылае сонца восені позняй
За борам сівым раўнадушна знікае.
Зара залаціцца ў чырвані рознай,
Ляціць у блакіт за малітвай ратая [2, с. 93].

**Заключэнне**. Вінцэсь Каратынскі ў творах «Уставайма, братцы!...» і «Таміла» пераважна выкарыстоўвае рэалістычныя апісанні прыроды ў спалучэнні з элементамі псіхалагічнага пейзажу для раскрыцця як уласных перажыванняў, так і перажыванняў сваіх герояў.

**Спіс цытаваных крыніц**


1. Беларуская літаратура і свет: ад эпохі рамантызму да нашых дзён : папуляр. нарысы. — Мінск : Радыёла-плюс, 2006. — 574 с.
2. *Каратынскі, В.* Творы : для старэйшага школьнага ўзросту / В. Каратынскі ; уклад., прадм. і камент. У. Мархеля. — Мінск : Маст. літ., 2009. — 334 с.
3. Літаратура Беларусі XIX стагоддзя : анталогія / уклад.: К. А. Цвірка, І. С. Шпакоўскі, К. У. Антановіч ; навук. рэд. А. В. Мальдзіс. — Мінск : Беларус. навука, 2013. — 862 с.
4. Паэтычны слоўнік / В. Рагойша. — 3-е выд., дапрац. і дап. — Мінск : Беларус. навука, 2004. — 576 с.
5. Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў : дапам. для настаўнікаў / М. А. Лазарук, А. Я. Ленсу. — Мінск : Нар. асвета, 1983. — 191 с.
6. Тэорыя літаратуры : дапам. для студэнтаў філалаг. спецыяльнасцей ВНУ / В. І. Яцухна ; М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Гомел. дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны. — Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2006. — 279 с.


УДК 821.161.3:82-3

**Л. А. Жураўлёва**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

## МЕСЦА ПАНЯЦЦЯ «ЭКФРАСІС» У СУЧАСНЫМ НАВУКОВЫМ ТЭЗАЎРУСЕ

**Уводзіны.** Ва ўсе часы існавала ўзаемасувязь паміж рознымі відамі мастацтва, што тлумачыцца агульнасцю іх мэт. Найбольш заўважнай з’яўляецца сувязь паміж літаратурай і выяўленчым мастацтвам, якія разнастайнымі спосабамі вобразна адлюстроўваюць рэальнасць, перадаюць думкі і пачуцці стваральнікаў, уздзейнічаюць на розум і пачуцці тых, хто ўспрымае іх творы [1, с. 29]. У пераходныя перыяды, калі ў структуры і свядомасці грамадства адбываюцца значныя змены, перад мастацтвам паўстае задача «пабудаваць новую, г. зн. сучасную мадэль свету і знайсці ў ім месца чалавеку» [2, с. 37]. Гэта патрабуе ад мастацтваў пэўнага збліжэння, падтрымкі. Адной з форм такога збліжэння з’яўляецца слоўнае апісанне твора мастацтва — экфрасіс (грэч. *ek* за межы чаго-небудзь, *phrases* гаварыць) [3]. Увага сучасных даследчыкаў да феномена экфрасіса настолькі ўзрасла — пра гэта сведчаць шматлікія публікацыі, канферэнцыі і сімпозіумы, прысвечаныя дадзенай праблеме, — што ёсць падставы гаварыць пра «экфрастычны бум» [6, с. 252].

**Асноўная частка.** Экфрасіс — адна з формаў узаемадзеяння паміж творамі літаратуры і выяўленчага мастацтва [1, с. 29]. Аўстрыйскі лінгвіст Леа Шпітцар вызначыў яго як «паэтычнае апісанне карціны ці скульптуры… узнаўленне пачуццёва адчувальных аб’ектаў творчасці пры дапамозе слоў» [4, с. 7]. Экфрасіс мае багатую гісторыю і глыбокія карані: першапачаткова ён быў рытарычным тэрмінам, які выкарыстоўваўся старажытнымі грэкамі для абазначэння візуальнага адлюстравання аб’екта, што падлягаў дэталёваму апісанню; перадачы ўласцівасцей і якасцей прадмета, знешнасці, пары года, месца і г. д. Самы красамоўны прыклад экфрасіса ў антычнай літаратуры — апісанне шчыта Ахіла ў 18-й песні «Іліяды» Гамера, дзе больш чым у ста дваццаці радках апісваецца, што будзе адлюстравана на шчыце, калі яго выкуе Гефест.

Першая ж сур’ёзная заява пра тое, што жывапіс і паэзія ўзаемазвязаны, зроблена Сіманідам Кеоскім (каля 556 — каля 467 да н. э.), адным з найбольш вядомых прадстаўнікоў грэчаскай харавой лірыкі. Ён сцвярджаў, што «паэзія — гэта гаваркая карціна, а карціна — маўклівы паэт» [1, с. 29]. Параўнанне літаратуры і жывапісу таксама можна знайсці ў творах Платона і «Паэтыцы» Арыстоцеля.

© Жураўлёва Л. А., 2019